# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

**І. А. Бурдзялёва**

## ПРАЯВЫ МАГІЧНАГА РЭАЛІЗМУ Ў АПОВЕСЦІ Ф. СІЎКО "УДОГ"

Нягледзячы на тое, што паняцце магічнага рэалізму ўпершыню з'явілася ў еўрапейскай культурнай прасторы, сам гэты феномен асацыюцца найперш з лацінаамерыканскім раманам, з творамі Г. Г. Маркеса, М. А. Астурыаса, А. Карпенцьера, Х. Л. Борхеса, К. Кастанеды і інш. Межы магічнага рэалізму не з'яўляюцца строга акрэсленымі, таму існуе цэлы шэраг канцэпцый, якія імкнуцца апісаць гэты мастацкі метад у яго асноўных рысах. Сітуацыя ўскладняецца і тым, што магічны рэалізм стаўся інтэрнацыянальнай з'явай, ён дапаўняецца і мадыфікуецца, знаходзячы сваё праяўленне не толькі ў лацінаамерыканскай, але і ў еўрапейскай літаратуры, і ў залежнасці ад культурна-гістарычных і ўласналітаратурных абставін набывае розныя інварыянты. Прадстаўніком балканскага магічнага рэалізму называюць М. Павіча, чэшскага – М. Кундэру, англійскі магічны рэалізм рэпрэзентуюць такія пісьменнікі, як Дж. Кэрал, С. Рушдзі, А. Картэр і іншыя. У творчасці сучаснай польскай пісьменніцы, Нобелеўскай лаўрэаткі В. Такарчук даследчыкі таксама адзначаюць прысутнасць характэрных рыс магічнага рэалізму.

У вызначэнні агульных рыс магічнага рэалізму можна абаперціся на аўтарытэтную працу А. Гугніна "Магический реализм в контексте литературы и искуссства XX века", у якой даследчык вылучае наступныя яго ўніверсальныя прыкметы: жыццепадабенства (абавязковая прысутнасць пазнавальных рысаў гістарычнай рэальнасці), арганічнае спалучэнне рэальнага і магічнага, пры якім магія не парушае асноўных законаў рэчаіснасці, аднаўленне ў правах міфічнага светапогляду побач з рацыянальным, антыўтапічнасць, антыпрагматызм, антыдагматызм. У беларускай літаратуры элементы магічнага рэалізму можна заўважыць у некаторых творах беларускіх празаікаў. У іх ліку – аповесць А. Жука "Паляванне на Апошняга Жураўля", В. Карамазава "Пушча", В. Казько "Неруш", "Хроніка дзетдомаўскага саду", "Выратуй і памілуй нас, Чорны Бусел", І. Бабкова "Хвілінка". Праявы эстэтыкі магічнага рэалізму ёсць і ў аповесці Ф. Сіўко "Удог".

Франц Сіўко – пісьменнік Віцебшчыны, які ўзнаўляе ў сваёй творчасці мастацкі вобраз паўночнай Беларусі ва ўсёй канкрэтыцы геаграфічных, бытавых і культурных рэалій. Тым не менш у аповесці "Удог", прасочваючы прыватныя лёсы сваіх герояў, насельнікаў вёскі Дубраўка, пісьменнік стварае абагульненую карціну беларускага быцця. Гэта быццё пазначана праблемай – стратай народам сваёй ідэнтычнасці, гістарычнай памяці, годнасці і волі быць гаспадаром і абаронцам свайго свету, свайго Дому. Гаворка ўрэшце вядзецца нават пра страту першаснага для ўсяго жывога біялагічнага інстынкту самазахавання. У аповесці гэтыя небяспечныя працэсы праваюцца, а потым множацца і ўзмацняюцца праз загадкавае дрэва *удог* з яго

магічнай сілай. Кволы парастак гэтага дрэўца быў прыўнесены і ўкаранёны на зямлі Дубраўкі яшчэ ў даўнім часе Лістападаўскага паўстання звонку, з чужой мясціны з ўмоўнай назвай Крайна. Прырода не ведае падобнай расліны. Гэты вобраз – творчая знаходка пісьменніка пры імкненні па-мастацку адлюстраваць ірацыянальныя, разбуральныя працэсы, якія адбываюцца ля асноў самой экзістэнцыі народа. Правобразам удога для аўтара відавочна былі інвазіўныя расліны, моцныя, жывучыя, атрутныя для тутэйшай экасістэмы, здольныя знішчаць мясцовую флору і запаланяць усё навокал. Пад магічнае ўздзеянне ўдога спачатку трапляюць жыхары Дубраўкі, а ў канцы твора вясковая цётка гаворыць: *Тут во ўперад адно было, а цяперака вун якія зараснікі... Днямі сястры маёй Фэлі дачка з-пад Гродны прыязджала. І там ужэ поўна гэтых дзераваў. Як наўмысля хто сеець.*

Тэматычна-ідэйную і сюжэтна-фабульную канву твора вызначае супрацьпастаўленне *свайго*, што ўвасабляецца ў прасторы тутэйшай вёсцы Дубраўка, і геаграфічна канкрэтна нявызначанай Крайны, якая выступае абагульненым вобразам *чужога* свету. Сюжэт аповесці разарваны і фрагментарны, ён ахоплівае даволі вялікі кавалак часу: ад паўстання 1831 г. і далей больш факусуецца на лёсах прадстаўнікоў адной вёскі ў перыяд 1960–1998 гадоў.

У мастацкім свеце твораў магічнага рэалізму адмыслова паяднаныя фантастычнае і рэальнае. У аповесці Ф. Сіўко магічнае арганічна ўплецена ў рэальны свет бытавой штодзённасці, адноўлены аўтарам з падрабязнымі дэталямі вясковага жыцця, гаспадарчай працы, сямейных стасункаў герояў. Магічнае ў творы не парушае законаў рэчаіснасці, ствараючы ўражанне жыццяпадабенства, прымаецца і не аспрэчваецца дзеючымі асобамі. Мастацкі свет аповесці з элементамі магічнага не супярэчыць гістарычнаму кантэксту, а цалкам сугучны і адпаведны яму.

Эстэтыцы магічнага рэалізму ўласціва выкарыстанне яркіх ёмістых вобразаў-знакаў, сімвалаў і метафар, часта запазычаных з фальклору. Так, у беларускім фальклоры ёсць нешматлікія "злыя" расліны, або камбінацыя раслін, адварам з якіх можна апаіць і затлуміць розум. Але аўтар свядома абірае не тутэйшую расліну, а ствараe фантастычны вобраз дрэва удог – метафарычны знак агрэсіўнага чужога свету. Злавесная сутнасць чужаземнай расліны падкрэсліваецца яго знешнім выглядам: колкія іголачкі на канцах лістоў, чырвоныя і салодкія ягады, гладкі, склізкі ствол, пакручастыя і няроўныя, але моцныя галіны. Яе з'яўленне на тутэйшай зямлі пазначана пагрозлівымі з'явамі: калі *вучыцелька* з Крайны Пелагея ўтыркае ў настылую зямлю парастак удога, раскаты грому скаланаюць наваколле. Учэпістасць і неверагодная жыццёвая сіла гэтай расліны перадаецца нават праз графічнае напісанне яго назвы з кручкаватым *г* на канцы, праз фанетыку слова – кароткае і цвёрдае яго гучанне. Не сам удог наўпрост, а салодкія ягады, на якія дрэва незвычайна ўраджайнае, і пітво з іх на нейкі час пазбаўляе розуму, свядомасці, скажае адэкватнае ўспрыняцце свету.

У творах К. Кастанеды, напрыклад, можна сустрэць апісанні псіхадэлічных раслін і напояў з іх, якія прыводзяць у стан зменeнай псіхікі (транс, медытацыя, сон). У аповесці Ф. Сіўко пітво з удогу замбіруе людзей і абуджае ў іх ірацыянальную прагу да разбурэння і знішчэння. Пакаштаваўшы

гарэлкі з ягадамі ўдога, вар'яцеюць паўстанцы-касінеры, яна ж была прычынай руйнавання ачмурэлым натоўпам толькі што адрэстаўраванай панскай сядзібы ў 1970-я гг, калі разгортваецца асноўнае дзеянне твора, пад'еўшы ягад удога, хлопчык Ромка бяздумна падпальвае пуню, у якой згарае бацька. Потым ён і сам згарыць у вогнішчы, раскладзеным на рэштках адноўленага панскага дому

Важным момантам магічнага рэалізму, падкрэсленым літаратуразнаўцамі, і які ўласцівы аповесці "Удог", з'яўляецца адмова ад псіхалагізму ў тлумачэнні ўчынкаў і паводзін герояў. І. Агеева піша пра характэрную "адмову ад псіхалагічнага дэтэрмінізму на карысць «калектыўнай свядомасці» і эпохі (ці гісторыі) як звышсілы". У аповесці сапраўды адсутнічае апісанне ці аналіз унутранага стану ці матывацыі герояў, ірацыянальныя паводзіны жыхароў Дубраўкі інспіраваныя магічным уздзеяннем удога. Само з'яўленне гэтага зла і яго культывацыя звязана з вобразамі трох пакаленняў жанчын адной сям'і, якія ў розныя часы, пачынаючы з 1831 г., прыязджаюць сюды з Крайны. Гэта Пелагея – Слава (вяскоўцы будуць зваць яе Стасяй) – Наталля. Яны ўвасабляюць сабой дэманічны пачатак і падобныя адна на адну знешне. У спадчыну яны атрымліваюць стары сшытак з рэцэптам атрутнага напою. Так, апошняя з гэтай троіцы, *прагледзеўшы яшчэ раз прабабуліны запісы, ... зачынілася ў істопцы, загадала Раману замураваць уваход у яе цэглаю. На два дні істопка ператварылася ў сакрэтны засек. Два дні Наталля не ела і не піла, награвала на пліце, выварвала, астуджала, зноў выварвала нейкае зелле. Дубраўцы, бачачы, як валіць з коміна чорны дым, толькі разводзілі рукамі*.

Метафарычна пісьменнік паказвае, як паступова мяняецца духоўны свет тутэйшага люду, яго якасныя характарыстыкі, мацнее адчуванне бязвольнасці, страху, абыякавасці, схільнасці да знішчэння найперш сваіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцяў. Небяспечна тое, што большасць тутэйшых не заўважае злавесна-спусташальнай сілы ўдога. Ён настолькі прыжыўся ў навакольным асяродку, што не толькі стаў звычайнай з'явай, але і на думку многіх прыносіць бясспрэчныя выгады: *Улетку ад сонца схавацца і паесць тэж. У вайну ягадамі ратаваліся. Расцець бо велькае і ягад многа*. У выніку такой падмены ва ўсведамленні свайго і чужога, дабра і зла, мяняюцца месцамі прычыны і наступствы ірацыянальных паводзін герояў. Сведчаннем такога пераіначвання духоўнай сутнасці, страты самасці, самавітасці, нацыянальнага разувасаблення ў аповесці служыць перайменаванне вёскі Дубраўка ў Падкрайну: *Скажы, дзякуй, цётка, што Свісцёлкай не назвалі. Усе вы тут свістуны, сваё прасвісталі*.

Адметна тое, што па заўвагах даследчыкаў у еўрапейскім выяўленчым мастацтве магічны рэалізм часта выступаў сінанімічным адменнікам тэрміна *постэкспрэсіянізм* з яго ўтрыраванымі, дэфармаванымі формамі і кідкімі прыёмамі, народжанымі адчуваннем дысгармоніі свету і крызіснымі грамадскімі з'явамі. У аповесці Ф. Сіўко элементы магічнага рэалізму таксама адлюстроўваюць трывожны настрой аўтара, звязаны з імкненнем ёміста і востра акрэсліць праблему і эфектыўна ўздзейнічаць на чытача.